Источник: “Голас Радзімы” – 2015-02-12

# У народа варта павучыцца

## Пачаўшы даследаваць помнікі народнага дойлідства, ураджэнец вёскі Кузьмічы Дзятлаўскага раёна Аляксандр Лакотка з часам стаў доктарам архітэктуры, доктарам гістарычных навук, прафесарам і акадэмікам

Пра тое, якія таленавітыя дойліды жывуць на Беларусі, могуць расказаць велічныя храмы, замкі, палацы. Вытанчаную прыгажосць, гармонію, якія часам нараджаюцца ў “геніяльнай простасці”, можна пабачыць і “Пад стрэхамі прашчураў” — так называлася, у прыватнасці, адна з цікавых кніжак даследчыка Аляксандра Лакоткі, прысвечаных народнай архітэктуры. Помніцца, як цікава, дасведчана праводзіў вучоны свае экскурсіі, калі працаваў яшчэ ў беларускім скансэне — так яшчэ называюць Музей народнай архітэктуры і побыту, размешчаны непадалёк ад рэчкі Пцічы ў мінскім прадмесці, пры вёсках Азярцо і Строчыцы. А свой 60-гадовы юбілей руплівец нядаўна адзначыў на адказнай пасадзе дырэктара Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.

З нагоды юбілею ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі было ўрачыстае пасяджэнне, прайшла прэзентацыя кніжнай выставы “Архітэктурны партрэт краіны ў гістарычна-культурным падарожжы “Адкрываючы Беларусь”. Юбіляра віншавалі кіраўнікі Акадэміі, прадстаўнікі Міністэрства культуры, шэрагу вышэйшых навучальных устаноў, яго калегі з інстытутаў акадэмічнага Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў, акадэмікі, архітэктары, мастацтвазнаўцы. Падкрэслівалі: Аляксандр Лакотка — буйны вучоны-мастацтвазнаўца, ён глыбока даследуе гісторыю архітэктуры і народнага дойлідства, шмат робіць для аховы гістарычна-культурнай спадчыны і развіцця на яе аснове турыстычных рэкрэацыйных зон. Больш за 270 навуковых прац на яго рахунку, у тым ліку 30 манаграфій. За падрыхтоўку шматтомнай працы “Беларусы” вучоны ў складзе аўтарскага калектыву ўшанаваны прэміяй Прэзідэнта Беларусі “За духоўнае адраджэнне” (2008), ён таксама лаўрэат прэмій Нацыянальнай акадэміі навук за манаграфію “Нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры” (1999) і за цыкл прац па развіцці турызму ў Беларусі (2011).

Іван Іванаў